# МЕСЯЦ І ЗОРКІ Ў КАРАВАЙНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ВЯСЕЛЛЯ

Д.М. Алексенка
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы
і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, Беларусь*

Ва ўмовах, калі глабалізацыйныя працэсы паставілі пад пагрозу захаванне самабытнасці і культурнай разнастайнасці народаў, наспела неабходнасць адраджэння нацыянальных традыцый, звычаяў і абрадаў, якія маюць вялікую сацыяльную каштоўнасць. Адным з моцных механізмаў забеспячэння ўстойлівасці і захаванасці нацыі і грамадства з'яўляюцца сямейныя абрады. Менавіта ў сям'і замацоўваюцца маральна-этычныя нормы паводзін чалавека ў грамадстве, даюцца духоўныя арыенціры, асэнсоўваюцца ідэі стварэння сям'і, працягу роду і выхавання дзяцей. Роля сям'і ва ўмацаванні гэтых устояў, у захаванні традыцыйнай культуры, такім чынам, становіцца надзвычай высокай.

Паколькі сям'я была і застаецца асновай грамадства, то стварэнне новай сям'і ў выніку шлюбу з'яўляецца важнай падзеяй у кожнага народа. На працягу стагоддзяў складваўся і беларускі традыцыйны шлюбны рытуал, якога прытрымліваліся ўдзельнікі вяселля ў шматлікіх абрадах, што выконваліся на розных яго этапах. Адным з важных абрадаў у беларускім вяселлі, як і ў вяселлі многіх рэгіёнаў Расіі і Украіны, быў каравайны абрад.

Каравайны абрад і яго паэзія добра захаваліся сярод мясцовага насельніцтва і дайшлі да нашага часу ў жывым бытаванні, па-ранейшаму выконваючы і ўтылітарную, і паэтычную функцыі. Пры гэтым каравайны абрад з'яўляецца развітым магічным абрадам і ўяўляе сабою комплекс узаемазвязаных паміж сабою рытуалаў, якія доўжацца на працягу ўсяго вяселля [3, с. 1]. У сувязі з гэтым, як адзначае Л. Ермакова, каравайны абрад і яго паэзія дазваляюць «зразумець "культурны кантэкст" з яго бытавымі апаэтызаванымі рэаліямі», даюць рэдкую магчымасць «убачыць і расшыфраваць сэнс як асобных знакаў, так і ўсёй міфапаэтычнай сістэмы», звязанай з каравайнай традыцыяй [3, с. 1−2].

З караваем як галоўным вясельным рытуальным хлебам звязаны нябесныя свяцілы, у прыватнасці месяц, зоркі. Гэта сувязь выяўляецца як у афармленні і ўпрыгожванні каравая, так і ў песнях, што суправаджаюць асноўныя моманты яго падрыхтоўкі.

У караваі ў розныя моманты вясельнага абраду актуалізуецца сімволіка то шлюбу, то лёсу і долі маладых,то дзетанараджэння ў маладой сям'і. Акрамя таго, у сімволіцы каравая спалучаюцца мужчынскі і жаночы пачаткі. На думку В. Іванова, «паколькі сам вясельны абрад можа разглядацца як узнаўленне боскага шлюбу (іерагаміі), першага ўзору, − натуральна дапусціць, што і каравай некалі функцыянаваў як рытуальны прадмет у найбольш урачыстых цырымоніях, дзе яго семіятычнае значэнне разгортвалася з найбольшай паўнатой» [4, с. 258].

Амбівалентная мужчынска-жаночая сімволіка каравая праяўляецца ў тым, што ў большасці мясцовасцей Беларусі яго выпякалі і ў жаніха, і ў нявесты [2, с. 147]. Пры гэтым караваі маладога і маладой часам адрозніваліся па знешнім выглядзе: у нявесты круглы каравай, а ў жаніха ў форме паўмесяца [13, с. 246]. Паводле запісаў Р. Зянкевіча, «наружная форма каравая набліжае яго да месяца, акружанага зоркамі: у сярэдзіне каравая лепяць месяц, па краях – зоркі, а потым ужо і іншыя выявы» [2, с. 380]. Апісанне каравая, акружанага выявамі зорак і месяца, даецца і ў наступнай песні: «*Биты коровай густо, // Подъ блюхно хусто, – // Мѣсяцемъ окружоны, // Зорами осадзоны*»[12, с. 368].Паказальна, што сам каравай часам і па сваёй форме, і ў

вербальных каментарыях атаясамліваецца з месяцам: «*Да й зьшоў мисячыкъ высоко. // Занэслы коровай далэко, // Да поставылы на жити, // Суды намъ, Боже, спожити!*» [2, с. 378]. М. Доўнар-Запольскі, каментуючы гэту песню, адзначае, што «каравай параўноўваецца з месяцам, выносіцца на жыта, паколькі ў ім ёсць сіла, якая садзейнічае ўрадлівасці поля» [2, с. 378].

Каравай у форме паўмесяца згадваецца ў некаторых песнях, як, напрыклад, у песні, дзе каравай кажа пра сябе «*я и рыгатъ, и быгатъ*» [8, с. 358], так і ў іншай песні, дзе маці нявесты просіць «*зляпіць каравай красны, як месяц ясны*» [11, с. 340]. Паводле М. Нікольскага, «у даным выпадку мы маем справу з выпадковай, мясцовай мадыфікацыяй традыцыйнага афармлення, якая ўзнікла ў сувязі са звычаем, шырока распаўсюджаным і ў Беларусіі, і на Украіне, упрыгожваць каравай зробленымі з цеста выявамі сонца, месяца і зорак як сімвалаў жонкі, мужа і дзяцей, а часам толькі аднаго месяца» [6, с. 190].

Разам з астранамічнымі шырока распаўсюджанымі пры аздабленні каравая былі зааморфныя фігуркі [12, с. 360–361]. Можна пагадзіцца з думкай А. Фядосіка, што «спалучэнне фігур зямных жывёл з касмічнымі свяцiламі на караваі мела гамеапатычнае магічнае значэнне з мэтай садзейнічаць дзетанараджэнню маладой сям'і, таму што і нябесныя свяцілы ў народнай міфалогіі паўставалі ў выглядзе мужа і жонкі...» [10, с. 135]. Некаторыя з астральных фігурак з'яўляліся не толькі элементамі ўпрыгожвання каравая, але і выступалі самастойнымі відамі вясельнага хлеба. Так, у Мазырскім пав., як вынікае з апісання К. Машынскага, у жаніха пяклі «месяц» у форме сярпа велічынёй на дзве далоні і «рагаля» – шышку ў маладой [10, с. 134]. Па сведчанні І. Насовіча, калі выпякалі некалькі караваяў, то першы рабілі ў выглядзе паўмесяца, другі каравай меў выгляд вялікай каўрыгі, трэці каравай – невялікая булка прызначалася для маладой [7, с. 141].

Нябесныя свяцілы таксама "прымалі ўдзел" і ў падрыхтоўцы вясельнага хлеба. Асаблівую цікавасць у гэтых адносінах прадстаўляюць каравайныя песні, дзе галоўнымі персанажамі паўстаюць сам месяц, які каравай «у печь сажая», «зоренька закладая», «слонейко запекая» [12, с. 378]. У дабраякасным караваі зацікаўлены і месяц: «*Свеціць месяц на двары, // Каравай гіблюць на сталі*» [1, с. 371]. Сувязь каравая з нябеснымі аб'ектамі падкрэсліваецца ў песні, якую выконваюць, калі выймаюць каравай з печы і кладуць яго на стол: «*Дэ ты буваў, наш слаўный коровай, // Шо ты там видаў? // Я бываў на нэби, под хмарою, // Відаў місяца з зорёю // И Васылька з жэною*» [8, с. 177].

Кожны момант падрыхтоўкі і выпечкі каравая паэтызаваўся, ідэалізаваўся і значнае месца тут адводзілася нябесным свяцілам. Гэта відавочна з наступнага песеннага дыялогу: «*Караваю мой маляваны, // Ды хто ж цябе маляваў: // Ці багі цябе малявалі, // Ці малыя бажанятачкі? // – Малявалі мяне зорачкі, – // Да расускія дзевачкі*» [1, с. 347]. А вось што спявалі пасля таго, як каравай быў пасаджаны ў печ: «*Як на небе зорачкі, // Так мае каравайчыкі, // Паміж імі месяц ясны, // Паміж малымі каравай старшы*» [9, с. 37]. Ці і такі варыянт: «*Колькі на небе зорачак – // То на караваі шышачак, // Як на небе ясныя – // Так на караваі красныя*» [5, с. 98]. Праз пару гадзін пасля таго, як каравай пасадзілі ў печ, старшая каравайніца, пераканаўшыся, што ўжо час яго вымаць, выгуквала: «*Браво, браво, нашо ўзяло – наш каравай упёкся, як пернічак румяненькі, як яблычко гладзенькі, як месячык... ясненькі, так каравай красненькі*» [9, с. 38]. Як вынікае з вышэйпрыведзеных песень, вобразы нябесных свяцілаў выкарыстоўваюцца на розных этапах каравайнай абраднасці і ў разнастайных абставінах, у розных мастацкіх прыёмах і формах.

Такім чынам, ва ўмовах глабалізацыі і трансфармацыі грамадства нельга перабольшыць усю важнасць і каштоўнасць звычаяў і абрадаў, якія дзейнічаюць як механізм самазахавання, самасцвярджэння народа. Веданне і апора на старажытныя традыцыі свайго народа, якімі з'яўляюцца сямейныя абрады, у прыватнасці вясельныя, дазваляе пабудаваць адносіны з навакольным светам, захаваць устойлівасць і стабільнасць у бурлівым патоку жыцця. У беларускім вяселлі нельга не адзначыць вялікую ролю каравайнага абраду і каравайных песень, дзе адметнае месца займаюць нябесныя свяцілы.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Вяселле. Абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі ; муз. дадат. З.Я. Мажэйка. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 683 с.

2. Довнар-Запольский, М.В. Исследования и статьи / М.В. Довнар-Запольский. – Киев : Типография 1-й Киевской Артели Печатного Дела, 1909. – Т.1 : Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. – 487 с.

3. Ермакова, Л.Л. Каравайные песни Белорусского Полесья (историография, семиотика, специфика жанров) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.09 / Л.Л. Ермакова; АН Беларуси, Институт искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы. – Минск, 1995. – 19 с.

4. Иванов, В.В. Исследования в области славянских древностей. Лексические и фразеологические вопросы реконструкции текстов / В.В. Иванов, В.Н. Топоров. – М.: Наука, 1974. – 342 с.

5. Лірыка беларускага вяселля / Пад рэд. Н.С. Гілевіча. – Мн. : Выш. школа, 1979. – 656 с.

6. Никольский, Н.М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н.М. Никольский. – Минск: Изд-во АН БССР, 1956. – 273 с.

7. Носович, И.И. Белорусские песни, собранные И.И. Носовичем / И.И. Носович. – СПб : Типография Майкова, 1873. – 282 с.

8. Романов, Е.Р. Белорусский сборник : в 9 вып. / Е.Р. Романов. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – 600 с.

9. Федароўскі, М. Люд беларускі. Вяселле / М. Федароўскі ; уклад., прадм. і пер. з польскай мовы І.У. Саламевіча. – Мн. : Полымя, 1991. – 142 с.

10. Фядосік, А.С. Функцыянальнасць і семантыка абрадаў, жанравыя і мастацкія своеасаблівасці паэзіі асноўных этапаў вяселля / А.С. Фядосік // Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А.С. Фядосік [і інш.] ; навук. рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мінск. : Бел. навука, 2001. – С. 107-272.

11. Шейн, П.В. Белорусские народные песни, с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями / П.В. Шейн. – СПб : Типография Майкова, 1874. – 562 с.

12. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: в 3 т. / П.В. Шейн. – СПб : Типография Императ. АН, 1890. – Т.1, ч.2 : Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – 708 с.

13. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал. : І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1989. – 575 с.

## ТЕНДЕНЦИИ ТРАНСФОРМАЦИИ СОЦИАЛЬНОЙ СТРУКТУРЫ СОВРЕМЕННОГО БЕЛОРУССКОГО ОБЩЕСТВА

М.С. Бодак

*Брестский государственный технический университет, г. Брест, Беларусь*

Сущность происходящих в Республике Беларусь процессов заключается в переходе к социально-ориентированной рыночной экономике. Этот переход сопровождается активным формированием новых слоёв и классов, что влечет за собой серьезную трансформацию всей социальной структуры общества. Наблюдается интенсивное